Гоўзіч І.М. (Мінск, Беларусь)

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ
## (матэрыял да вывучэння аглядавай тэмы ў XI класе)

Сучасная беларуская паэзія (за гады яе адліку мы бярэм сярэдзіну 80-х гадоў XX стагоддзя) – складаная шматгранная з’ява, пазначаная «арыгінальнымі мастацкімі набыткамі, жанравай і стылёвай дынамікай, цікавымі творчымі пошукамі» [7, с. 39], у «прасторава-часавай структуры» якой перакрыжоўваюцца набыткі розных пісьменніцкіх пакаленняў. Найперш гэта мастакі слова, якія праявілі сябе як яркія творчыя індывідуальнасці ў даваенны ці ваенны перыяд – Максім Танк (зб. «Збор калосся» (1989), «Мой каўчэг» (1994), «Errata» (1996), Анатоль Вялюгін (зб. «Заклён на скрутны вір» (1995), Пімен Панчанка (зб. «І вера, і вернасць, і вечнасць» (1986), «Прылучэнне» (1987), «Горкі жолудь» (1988), «Неспакой» (1988), «Высокі бераг» (1993), Сяргей Грахоўскі (зб. «Верую» (1987), «І радасць і боль» (1988), «Недапісаная кніга» (1996) і інш.

Прадстаўнікі маладзейшага пакалення ўвайшлі ў літаратуру ў 50 – 60-я гады мінулага стагоддзя – гэта так званае «філалагічнае пакаленне»: Рыгор Барадулін (зб. «Самота паломніцтва» (1990), «Міласэрнасць плахі» (1992), «Евангелле ад Мамы» (1995), «Ксты» (2005), «Быць! То Be!» (2006), Анатоль Вярцінскі («Хлопчык глядзіць» (1992), Васіль Зуёнак (зб. «Лета трывожных дажджоў» (1990), «Чорная лесвіца» (1992), «Пісьмы з гэтага свету» (1995), Янка Сіпакоў (зб. «Ахвярчы двор» (1991), Ніл Гілевіч (зб. «Жыта, сосны, валуны» (1992), «На высокім алтары» (1994), Уладзімір Караткевіч (зб. «Быў. Ёсць. Буду» (1986), Міхась Стральцоў (зб. «Мой свеце ясны» (1986), Яўгенія Янішчыц (зб. «Каліна зімы» (1987), «У шуме жытняга святла» (1988) і інш.

Развіццё слоўнага мастацтва на сучасным этапе звязана з творчай дзейнасцю наступных яркіх індывідуальнасцей, якія заявілі пра сябе ў 80 – 90-я гг. XX стагоддзя: Мікола Мятліцкі (зб. «Горкі вырай» (1989), «Палескі смутак» (1991), «Бабчын» (1996), «Хойніцкі сшытак» (1999), «Жыцця глыбінныя віры» (2001), Сяргей Законнікаў (зб. «Сутнасць» (1987), «Заклінанне» (1990), Алесь Разанаў (зб. «Вастрыё стралы» (1988), «У горадзе валадарыць Рагвалод» (1992), «Паляванне ў райскай даліне» (1995), «Рэчаіснасць» (1998), «Кніга ўзнаўленняў» (2005), «Лясная дарога» (2006), «Дождж: возера ў акупунктуры» (2007), Ірына Багдановіч (зб. «Чаравікі маленства» (1985), «Фрэскі» (1989), «Вялікдзень» (1993), Анатоль Сыс (зб. «Агмень» (1988), «Пан Лес» (1989), «Сыс» (2002), Віктар Шніп (зб. «Гронка святла» (1983), «Пошук радасці» (1987), «Шляхам ветру» (1987), «Горад Утопія» (1990), «На рэштках Храма» (1994), «Балада камянёў» (2006), Леанід Дранько-Майсюк (зб. «Вандроўнік» (1983), «Над пляцам» (1986), «Тут»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(1990), «Акропаль» (1994), «Стомленасць Парыжам» (1995), Леанід Галубовіч («Таемнасць агню» (1984), «Споведзь бяссоннай душы» (1989), «Таемнасць споведзі» (1993), «Заложнік цемры» (1994), «Зацемкі з левай кішэні» (1998), «апошнія вершы леаніда галубовіча» (2000), Людміла Рублеўская «Крокі па старых лесвіцах» (1990), «Адукацыя» (1990), «Замак месячнага сяйва» (1992), «Шыпшына для Пані» (2007), Міколы Шабовіч («Падары мне сваю адзіноту» (2002), «Мая надзея» (2006), «Хор болей не спявае (2008) і інш.

Самая маладая генерацыя маладых літаратараў прэзентавана імёнамі Віктара Жыбуля, Андрэя Хадановіча, Вікі Трэнас, Алеся Аркуша, Усевалда Гарачкі і іншых літаратараў.

На сучасным літаратурным працэсе пазітыўна адбіўся і актыўны ўдзел у ім моладзі, стварэнне ёю творчых суполак. Калі старэйшыя пісьменнікі пераважна з’яўляюцца прыхільнікамі рэалістычнай творчасці, дык моладзь больш хінецца да мадэрнізму і постмадэрнізму, сучаснага авангарду, што ідзе з Захаду і з Расіі, адмаўляе многія ранейшыя пазітыўныя каштоўнасці і гармонію стылю, аднак падштурхоўвае літаратараў да эксперыменту як у галіне зместу, так і ў галіне формы. Найбольш плённымі з’яўляюцца ў нашы дні, як думаецца, ідэйныя і вобразныя пошукі паэтаў, празаікаў, драматургаў і крытыкаў, якія стварылі ў 1987 годзе літаратурную суполку «Тутэйшыя» (А. Асташонак, П. Васючэнка, А. Глобус, С. Кавалёў, А. Сыс, М. Шайбак і іншыя) і выступілі супраць «манапалізму Саюза пісьменнікаў на кіраванне літаратурным працэсам, патрабуючы стварэння новых, больш гнуткіх мастацкіх іерархій, у якіх бы знаходзілася месца не толькі «літаратурным генералам», але і таленавітай моладзі» [14, с. 27]. Творчасць маладых літаратараў была пераважна зарыентаванана на нацыянальныя каштоўнасці, створаныя класікамі нашага слоўнага мастацтва – Францішкам Багушэвічам, Янкам Купалам, Максімам Багдановічам, Максімам Гарэцкім і Уладзімірам Караткевічам (які, дарэчы, лічыўся імі апошнім носьбітам нацыянальнага ідэалу).

Напрыканцы мінулага стагоддзя (1993 г.) было створана «Таварыства вольных літаратараў» (І. Сідарук, А. Аркуш, Л. Сільнова, Л. Сом і інш, мастацкая праграма якога зводзілася да адмаўлення ранейшых традыцый і выпраўлення памылак папярэдняга літаратурнага таварыства, а таксама да адмаўлення культурнага цэнтрызму сталіцы.

У 1995 годзе з’явіўся новы літаратурны рух – «Бум-Бам-Літ» (Зм. Вішнёў, С. Мінскевіч, А. Туровіч, В. Жыбуль і інш.). Творчасць паводле тэорыі і практыкі гэтага таварыства павінна адмовіцца ад класічнага жанрава-тэматычнага аблічча і пазітыўнага пачатку ўвогуле, уяўляць сабой

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

своеасаблівую эпатажную самапрэзентацыяю аўтараў, слова якіх атрымала б права на існаванне па-за тэкстам, па-за перадачай інфармацыі.

Сучасная паэзія канца XX – пачатку XXI стст. вызначаецца спалучэннем і ўзаемадзеяннем публіцыстычнага, філасофскага, эталагічнага і выяўленча-апісальнага пачаткаў у мастацкай творчасці, пашырэннем тэматычных абсягаў лірыкі ў сувязі са зменамі у грамадстве (дэмакратызацыя, перабудова, галоснасць), што заўважыў і адзначыў вядомы даследчык У.Гніламёдаў. Ён вылучыў значна больш мастацка-стылявых плыняў у сучаснай лірыцы параўнальна з папярэднімі перыядамі яе развіцця: «лірыка-апавядальную, публіцыстычную, філасофска-аналітычную, мастацка-сінкрэтычную і універсальна-філасофскую» [12, с. 151]. Менавіта па гэтай прычыне ў слоўным мастацтве дадзенага перыяду, а асабліва ў лірыцы як самым «аператыўным і кампактным» родзе літаратуры «ўсталёўвалася <…> крытычнае і праўдзівае ў сваёй аснове, успрыманне рэчаіснасці, набылі пераасэнсаванне ці вострае гучанне многія тэмы» [7, с. 39]. Нягледзячы на прэзентаванасць сучаснай беларускай літаратуры шматлікімі пісьменніцкімі пакаленнямі, тэматычную і жанравую разнастайнасць мастацкіх пошукаў пісьменнікаў, яна ўяўляецца надзвычай цэласнай з'явай – «гэта ўсё ж такі адна і тая ж літаратура, адзін і той жа спосаб мастацкага спасціжэння жыцця, які характэрны <…> беларускаму тыпу мастацкай культуры» [22, с. 5].

Адной з асаблівасцей сучаснай беларускай паэзіі становіцца яе інтэлектуалізацыя, арыентацыя на роздумнасць, медытатыўнасць. Падобны пачатак знаходзіць сваё заканамернае выяўленне ў творчасці Максіма Танка, Анатоля Вярцінскага, Мар'яна Дуксы, Алеся Разанава, у пэўнай ступені, Пімена Панчанкі. Філасофская лірыка ўяўляе сабой вышэйшы этап руху мастацкай творчасці беларусаў да інтэлектуалізацыі, пераразмеркавання суадносін паміж «рацыё» і «эмоцыё», разважанне-медытацыю пра вечныя праблемы чалавечага існавання: Жыццё і Смерць, Часовае і Вечнае, Дабро і Зло, Чалавек і Прырода і г.д.

Так у сваіх апошніх творах Максім Танк арыентуецца на доказнасць, лагічную стройнасць і строгасць, уяўляе разгорнутыя разважанні з самім сабой і з апанентамі, суразмоўцамі – зямлёй і небам, сонцам і зорамі, дрэвамі і рачнымі хвалямі, звярамі і птушкамі і, вядома, людзьмі: *«Старыя дрэвы / Я з пашанай спыняюся / Перад імі ў прывітанні, / Бо многім абавязаны ім / У сваім жыцці. / Хаця вядома: / У іх цараванай засені / Заўжды расці нялёгка»* [24, с. 24]. У працытаваным верлібры «Старыя дрэвы» выяўляецца надзвычай важная думка пра пакаленні і іх узаемасувязь, пра шанаванне продкаў і шкадаванне нашчадкаў, якім нялёгка знайсці сваё месца ў жыцці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Анатоль Вярцінскі таксама з’яўляецца мастаком філасофскага складу мыслення. Часцей за ўсё прытчы («Косім траву – яна не крычыць...», «Ноччу заплакала дзіця», «Вы зразумейце правільна...» і інш.) і элегіі («З жалем гляджу на дзіця...», «Хлопчык глядзіць», «Мы жывём, каб вяртацца...», «Трагічна-сумная няўвязка...») А. Вярцінскага прасякнуты думкамі пра чалавека і чалавецтва, рух і зменлівасць часу, пра страту кахання, пра непазбежную смерць, пра прадаўжэнне жыцця ў нашчадках: *«Хлопчык глядзіць... / Я ў позірку тым дзіцячым / Бачу пачатак сябе, / Сваё прадаўжэнне бачу... »* [9, с. 309].

Мар’ян Дукса ўжо ў самым пачатку свайго творчага шляху таксама засяродзіўся на вечных праблемах вытокаў, памяці (*«Адна за адной адзываюцца струны, // Пякучыя струны – забытыя словы»*), часу, «пявучая плёнка» якога круціцца і круціцца, духоўнай сувязі чалавека з прыродай, на ўлонні якой паэт адпачывае душой, не адмаўляючыся ад уласцівай яго равеснікам паэтызацыі роднага кутка, басаногага дзяцінства, жыцця вёскі.

Новае, больш шырокае гучанне ў творчасці паэтаў на сучасным этапе атрымлівае грамадзянска-публіцыстычны пачатак, які становіцца дамінантным у многіх вершах П. Панчанкі, М. Танка, Н. Гілевіча, В. Зуёнка, Г. Бураўкіна і інш. Паэты ствараюць мастацкі свет, у цэнтры якога стаіць чалавек-мысліцель, філосаф, палітык, публіцыст, грамадзянін, які клапоціцца пра лёс Бацькаўшчыны і мовы.

Паэзія Пімена Панчанкі апошніх дзесяцігоддзяў вызначаецца публіцыстычнай палкасцю. Паэт абараняе канцэпцыю жыцця, паводле якой чалавек сцвярджаецца як асоба актыўная, мэтанакіраваная, як вечны шукальнік, непрымірымы да мінімальных праяваў фальшу і няшчырасці, прыстасаванства. Элегія П. Панчанкі «Развітанне» напоўнена горкім расчараваннем, непрыхаваным і шчымлівым болем, зняверанасцю лірычнага героя ў адраджэнне роднай мовы, якога адлучылі ад родных слоў і Бацькаўшчыны (*«Мы забылі пра вольнасць / Старажытных сваіх гарадоў»)*. Твор заснаваны на мастацкай інтэрпрэтацыі і асуджэнні падзей, у выніку якіх многім народам было адмоўлена ў праве «людзьмі звацца» праваднікамі палітыкі сталінскага генацыду ў адносінах да малых народаў, а таксама бяздумнымі адносінамі да беларускіх земляў і мовы (*«Вучы дзяцей французскай, / Ангельскай, / Эсперанта, / Але не беларускай»*).

Сэнсава і эмацыянальна блізкай па тэматыцы да творчасці названых пісьменнікаў з’яўляецца большасць вершаў Ніла Гілевіча са зборнікаў «Жыта, сосны, валуны» і «На высокім алтары» («Б’юць у сэрца», «Скора, скора», «Праклён», «І ўсё-такі дойдзем», «О любыя мае...»). Думкай пра самавызначэнне беларускай супольнасці як раўнапраўнай, годнай нацыі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

багатай мінуўшчынай, з магутнымі каранямі, усведамленне важнасці фактару захавання спадчыны народам, які жыве сярод больш магутных суседзяў прасякнуты верш Ніла Гілевіча «Адкажы!», напісаны ў форме непасрэднага звароту-закліку да суайчыннікаў. Лірычны герой выразна ўсведамляе складанасць лёсу Беларусі і папярэджвае будучыя пакаленні, што можа стацца з народам, які адрачэцца ад сваёй мовы, гісторыі, ад памяці продкаў. Менавіта па гэтай прычыне цэнтральнымі сэнсавымі вобразамі-універсаліямі, на якіх трымаецца верш, становяцца вобразы «храма», які сімвалізуе Радзіму, мову, Бацькаўшчыну, «крыжа» – сімвал гістарычных выпрабаванняў Беларусі і адначасова свабоды, ачышчэння.

На сучасным этапе развіцця літаратуры ўзмацняецца цікавасць паэтаў і празаікаў да гістарычнага мінулага як асновы фарміравання нацыянальна адметнага. Таго пачуцця, што ператварае чалавека ў грамадзяніна, які пачынае клапаціцца не толькі пра свой асабісты лёс, але і пра лёс краіны. Гістарычная тэматыка ў сучаснай паэзіі годна прадстаўлена зборнікам «Кніга ўзнаўленняў» Алеся Разанава – своеасаблівай энцыклапедыяй складанай гісторыі Беларусі. Паэт стварае літаратурныя наследаванні адкрытай дыдактычнай накіраванасці, перакладае на сучасную літаратурную мову творы, напісаныя знакамітымі асветнікамі, рэлігійнымі і дзяржаўнымі дзеячамі (Кірылам Тураўскім, Францыскам Скарынай, Сымонам Будным, Васілём Цяпінскім, Іпаціем Пацеем, Язэпам Руцкім, Кірылам Транквіліён-Стаўравецкім, Мялеціем Сматрыцкім, Львом Сапегай).

Своеасаблівы падыход да раскрыцця гістарычнай тэмы выяўляецца ў творчасці Алеся Пісьмянкова (вершы «Якаў Палачанін», «Дума Вітаўта»), Максіма Танка («Гравюры Скарыны»), Віктара Шніпа («Язэп Драздовіч», большасць балад з кнігі «Балада камянёў»), Людмілы Рублеўскай («Балада пра Франца Савіча», «Мялецій Сматрыцкі») і інш. У творах паўстае галерэя постацей выбітных гістарычных асоб, жыццё і дзейнасць якіх паэты лічаць узорамі маральнай дасканаласці і грамадзянскай самаахвярнасці. Героі падобных твораў набываюць адзнакі мастацкага абагульнення: паўстаюць не толькі ў абліччы канкрэтных гістарычных асоб, а і адраджэнцаў-волатаў, падобных былінным асілкам, гатовых аддаць жыццё за радзіму: *«Ён – Сапега, Сапегу свет знае, / Як сам знае Сапега любоў / Да зямлі, на якой нарадзіўся, / За якую маліўся і біўся…»* [25, с. 15].

Тэма мовы, роднага краю «падсвечваецца» вобразамі рэальных гістарычных асоб не толькі ў творчасці прадстаўнікоў старэйшых пакаленняў, але і ў лірыцы маладых літаратараў, якія зрабілі важкі ўнёсак у раскрыццё народных звычаяў, традыцый, у асэнсаванне праблемы захавання роднай мовы ў яе «нярушным» стане. Так А. Сыс стварыў пранікнёны вобраз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

роднай мовы як самага святога скарбу на зямлі («Маналог Каруся Каганца», «Маналог Апанаса Філіповіча», «Маналог Сяргея Палуяна», «Маналог Рамуальда Жакоўскага», «Маналог Уладзіміра Жылкі», «Маналог Алеся Гаруна»): *«Нам мова далася крывёю / ды выпаленымі вачыма, / хавалі яе, як зброю, / насілі, як горб за плячыма»* [23, с. 240]. У вершах на гістарычную тэматыку А. Сыс апавядае, стрымліваючы асабістыя эмоцыі і перажыванні, захоўваючы рысы эпічнай творчасці (падзейны сюжэт, разгорнуты ў дзеянні канфлікт, канкрэтныя, зрокава-прадметныя мастацкія дэталі).

Адным з дамінантных пытанняў літаратуры канца ХХ ст. становіцца пытанне пра выдаткі НТР, наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС. «Постчарнобыльская эра прынесла непрадказальныя змены ў грамадскую свядомасць, прымусіла задумацца і пераканацца, што пісаць так, як раней, не пажадана. Ці можна пасля Чарнобылю ўвогуле займацца вершатворчасцю, марыць пра высокія матэрыі?» [10, с. 45], – выказвае меркаванне Л. Гарэлік. Паэты адчуваюць асабістую далучанасць да лёсу роднага краю, немагчымасць ствараць «светлыя» вершы: *«Нават у мройныя / зорныя ночы / светлыя вершы / прыходзіць не хочуць»* [16, с. 36].

Глыбінёй перажыванняў, непрыхаванай трагедыйнасцю, якія маюць грунтам асабіста перажытае, вызначаюцца вершы Міколы Мятліцкага, прысвечаныя Чарнобыльскай аварыі. Паэт разам з землякамі перажыў адсяленне з роднай вёскі, таму гучаць яго творы як дакумент-прысуд чорнай бядзе. Па словах М. Арочкі, «Гаркота «палескага смутку» пачала, бадай, цалкам трымаць у палоне вершы М. Мятліцкага, – іх вызначае ўласна перажытая, сэрцам убачаная дэталізацыя, шчымлівая густата канкрэтных адзнак бяды...» [1, с. 71]. Лірычны герой вершаў паўстае выгнаннікам (*«Брыдуць яны – палоннікі журбы / Выгнаннікі заложнікі нядолі»* [15, с. 256]), які не можа пераадолець адлучанасць ад роднай зямлі, ад блізкіх, дарагіх сэрцу мясцін, што сталі палігонам смерці: *«Тут мёртва ўсё... / Спалошлівы прывід / Астатняе выгнанніцы – вясны. / У дзікарослых травах краявід. / Стаю, жыццё, каля тваёй труны»* [15, с. 49]. Паэт стварае аднатонны графічны малюнак спустошанай малой радзімы, выкарыстоўваючы пераважна змрочныя, цёмныя колеры, перадае імі драматызм душэўнага стану лірычнага героя («*чорная ява*», «*ноч*», «*чорны чалавек*» і інш.).

Амаль кожны верш Максіма Танка 80 – 90-х гадоў ХХ стагоддзя насычаны медытатыўнасцю і псіхалагізмам з абавязковым выхадам з лакальнага перажывання і асабістага пачуцця на ўсеагульны драматызм і ўніверсальную трывогу за свет з адзнакамі філасафізму і псіхалагізму. Кожны твор паэта становіцца своеасаблівай драмай у вершах. Таму часта

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

лірычны герой адчувае ці прадчувае сваё «выпадзенне» з часу, яму думаецца, што ён рухаецца не ў нагу з гістарычнымі падзеямі. Так нараджаюцца вершы-рэквіемы, своеасаблівыя элегіі смерці пра новы Апакаліпсіс – Чарнобыль («Тут Беларусь была», «З новага Апакаліпсіса» і інш.): *«Забойчая пошасць Чарнобыля / Асіраціла хаціну, / І дзверы забіла, і вокны / Заткала бяльмом павуціны. / Смяротны яе подых чуецца / У чалесніку печы счарелай, / У гушкалцы-люльцы дзіцячай, / Што стала апошняй пасцеляй. / <…> І хоць сонца свеціць, як некалі, / Але ўсё ў душы ледзянее, / Цярністым вянком на хаціне / Пустая буслянка чарнее»* [24, с. 33].

Трагедыйнай напружанасцю і экспрэсіўнасцю вызначаецца мастацкае асэнсаванне наступстваў Чарнобыльскай катастрофы ў паэме Янкі Сіпакова «Одзіум», дамінантнымі вобразамі-сімваламі ў якой становяцца Катаклізм, Апакаліпсіс, Катастрофа як увасабленне непапраўнай бяды і трагедыі: *«Два браты і сястра з нетутэйшымі імёнамі – Катаклізм, Апакаліпсіс і Катастрофа – нецярпліва, прагна ўглядаюцца ў тутэйшую зямлю і ласкава глядзяць па раскудлачаных валасах сваю нашчадніцу, спадкаемніцу, якая, ці чуеце, мае такое ўжо тутэйшае імя – Бяда»* [20, с. 355]. Цэнтральным у паэме становіцца вобраз старой жанчыны – бабкі Параскі, якая не можа зразумець, чаму яе чысценькае цяля стала брудным, а ўвесь навакольны свет – атручаным (*«Хіба чыстая трава можа быць бруднаю? / Хіба чыстая трава можа быць нячыстаю? / Хіба цялятка можа быць забруджаным, калі / яно п’е чыстую вадзіцу і скубе чыстую / травіцу?»* [20, с. 355]), нават спрабуе змыць з цяляці нябачны атамны бруд. Паэма пабудавана з дапамогай мастацкага прыёма антытэзы, калі жыццю супрацьпастаўляецца смерць, дабру – зло, шчасцю – гора, прыродныя з’явы, што неслі жыццё, становяцца сімваламі смерці: «*Была, ці чуеце, вёска, а стала зона адсялення. / Было поле, а стала зона адчужэння. / Быў лес, а стала зона пастаяннага радыяцыйнага кантролю. / Былі грады, а стала зона перыядычнага дазіметрычнага кантролю*» [20, с. 358]. Паэма пабудавана на цыклічным выкарыстанні малітвы «Ойча наш», якая пастаянна перарываецца аўтарскім празаічным тэкстам, гістарычнымі даведкамі, статыстычнымі дадзенымі, устаўнымі элементамі.

Многія творы Міхася Башлыкова (вершы са зборніка «Пяро зязюлі падніму», паэма «Лілея на чорнай вадзе») прысвечаны асэнсаванню прычын і наступстваў экалагічнай катастрофы, у іх гучыць трывожны роздум пра будучыню, духоўны Чарнобыль: «*Нацыя, / Якая пакорна маўчыць, / Якая забыла пра годнасць, / Якая не ўмее даражыць: / Ні краем, / Ні словам родным, / Якая памерці згодна, / Ці мае права / Нацыяй быць?!.*» [6, с. 160].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Развіццё і тэматычнае пашырэнне сучаснай беларускай паэзіі адбывалася, пэўным чынам, і за кошт урбаністычнай тэматыкі, што можна патлумачыць прыходам у літаратуру новай генерацыі творцаў, якія нарадзіліся ў горадзе. Можна назваць вершы Адама Глобуса з кніг «Парк» і «Скрыжаванне» («Горад», «На прыпынку», «1989. Мінск. Траецкае прадмесце», «1939. Вільня. Слова беспрацоўнага», «Беларускія краявіды»), у якіх аўтар з дапамогай штрыхоў-вобразаў (*афішы, новабудоўлі, хлапечае жыццё мікраараёнаў, транспарт* і г.д.) стварае цэласную карціну гарадскога жыцця, дзе лірычны герой адчувае сябе ўтульна і спакойна: *«Афішы, перахрышчаныя клеем, / Чытаюцца дзяўчынкай па складах. / Новабудоўлі моцна пахнуць клеем, / Вартаўнікі сумуюць пры складах. / Хлапечае жыццё мікраараёнаў / Заблыталася ў бітумнай смале. / Будзільнікам зялёным, электронным / Міргае вока часу на стале»* [11, с. 10].

Некаторыя сучасныя паэты ўспрымаюць горад не толькі як крыніцу успамінаў і перажыванняў, як сведку маленства, юнацтва, першага кахання, але і як жорсткі, бяздушны свет, абнесены прывіднымі сценамі, як «месца», дзе валадарыць халодны вецер (вершы Галіны Булыкі са зборніка «Турмалін», Галіны Каржанеўскай з кнігі «Асенні мёд», Людмілы Рублеўскай са зборніка «Замак месячнага сяйва»): *«Гарадскім скразнякам не хапае прасторы / Размахнуцца ў вятры, / Замахнуцца на лёс. / Перспектывы праектаў / Развейвае горад / На няўтульны бясконцы крыштальны мароз»* [8, с. 44]; *«Паламаныя лаўкі / прыгожа засцеле лістота, / Паламаныя лёсы / прыміраццца з болем глухім / Гэта – восень зямлі, / гэта жоўтая песня самоты. / Гэта – вочы шкляныя праспекта / і цемра над ім»* [19, с. 105]. Падобны элегічна-тужлівы, часам нават трагедыйны настрой урбаністычнай лірыкі большасці паэтак тлумачыцца найперш спустошанасцю і непрыкаянасцю чалавечых душ.

На думку некаторых даследчыкаў, новай рысай сучаснай паэзіі «стаў зварот беларускіх паэтаў да рэлігійна-хрысціянскай і біблейска-філасофскай тэматыкі. <…> Імя Бога вярнулася ў нашу паэзію як сімвал духоўнага выратавання і заступніцтва. Бог, пошук Боскага ў чалавечым існаванні, прага ачышчэння, чалавекалюбства, далучэнне душы да вечнага, хрысціянскага, усяго святога – вось тое кола матываў, якое вызначае змест твораў рэлігійна-духоўнай скіраванасці» [7, с. 59 – 60]. Адной з асаблівасцей новай мастацкай свядомасці з'яўляецца адчуванне майстрамі слова адсутнасці ярка выражанага памежжа паміж Жыццём і Смерцю. І ў сувязі з гэтым многія сучасныя аўтары – А. Разанаў, Р. Барадулін, І. Багдановіч, Д. Бічэль, М. Шайбак, А. Мінкін, А. Глобус і іншыя – разглядаюць смерць не толькі і не столькі як фізіялагічны канец чалавека, а як своеасаблівы пераход яго ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іншае жыццёвае вымярэнне. Падобнае тлумачэнне сутнасці смерці, выкліканае эсхаталагічным настроем, уласцівым постмадэрнісцкаму напрамку ў літаратуры. Адно з асноўных месцаў у лірыцы паступова займае малітва-зварот да Бога з просьбай выратаваць Беларусь, «дараваць грахі, даць годны лёс беларускаму народу» [10, с. 72], адрадзіць, дапамагчы і падтрымаць Радзіму ў складаны перыяд: *«Над бацькаўшчынай сумнай і прыгожай, / Зачараванай чарам летаргіі, / Прыадчыні аблік твой светлы, Божа, / Праліся ў душы тайнай літургіі»* [2, с. 3].

Многія з напісаных у апошнія дзесяцігоддзі вершаў Р. Барадуліна маюць форму рэлігійна-медытатыўных роздумаў, малітваў і літанняў: *«Божа, пашлі Беларусі / Ласку з Тваімі вачамі, / Сэрцы суцеш у скрусе, / Злітуйся над крывічамі. <…> Хай беларус беларуса / Будзе любіць як брата. / Светлая Імем Ісуса / Наша крывіцкая хата. / Божа, на ўсіх раздарожжах / Нас ад напасцяў варожых / Твой зберажэ напамін. / Амін»* [3, с. 60].

Каханне («чыстая краса») – адна з самых старажытных тэм у сусветнай літаратуры і найперш лірыцы, бо па словах даследчыкаў «найвышэйшай праявай духоўнасці асобы, яе своеасаблівага азарэння з'яўляецца стан закаханасці. Здольнасць кахаць сведчыць пра багацце і шчырасць душы» [10, с. 60]. Тэма кахання як жыватворнай крыніцы духоўна-маральнага вобліку асобы ў сучаснай беларускай паэзіі звязана з імёнамі Леаніда Дранько-Майсюка («Стомленасць Парыжам», «Акропаль»), Раісы Баравіковай («Каханне), Ніны Мацяш («Душою з небам гаварыць»), Галіны Каржанеўскай («Асенні мёд»), Яўгеніі Янішчыц («Каліна зімы») і інш.

Творчасць Яўгеніі Янішчыц вызначаецца шчырасцю, натуральнасцю інтанацыі, напружанасцю і ўнутранай канфліктнасцю пачуцця: *«Белапушыстыя ўскінуты бровы. // Час замірання. І час адкрыцця. // Доля мая – нібы гронка любові // Б'ецца над сцішанай голькай жыцця»* [27, с. 322]. Паэтыка Я. Янішчыц характарызуецца арганічным сінтэзам разнастайных «кніжных» прыёмаў і сродкаў пісьма вуснай народнай творчасці, «павязваецца» індывідульна-аўтарскім падыходам да вобразатворчасці. Паэтэса ўмее перадаваць у вобразах складанасць настрою, душэўнага стану, яе песеннае слова выказвае рух і жэст чалавечай душы, узрушанай святам і драмай быцця, захопленай радасным светам быцця, шчырасцю і непасрэднасцю. Лірыка Яўгеніі Янішчыц паўстае як мастацкая творчасць, што эвалюцыянавала ад апісальнасці, выяўленчасці, непасрэднага, пачуццёвага светаўспрымання да яго глыбокага, рэфлектыўнага асэнсавання.

Дамінантным архетыповым вобразам паэзіі Леаніда Дранько-Майсюка («паэта, які кахае») стаў вобраз вандроўніка па чужых гарадах і краінах – сімвал духоўнага пошуку чалавека, які нязменна вяртаецца да бацькаўшчыны

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

і жанчыны як крыніц прыгажосці і эстэтычнага ідэалу. Таму невыпадкова найвышэйшай праявай прыгажосці для паэта становіцца – каханне. Адзін з лепшых зборнікаў Л. Дранько-Майсюка «Акропаль» складаецца з метафарычных ego-essai (своеасаблівы жанравы сінтэз эсэ і філасофскага разважання) «Ратаванне Грэцыяй» і «Стомленасць Парыжам». Кніга – яркае сведчанне таго, што аўтар арыентуецца на сусветную культуру і свядома сцвярджае ідэю «мастацтва для мастацтва» («чыстай красы»): апявае найперш прыгажосць – прыроды, штодзённага жыцця, складае гімн жанчыне. Звычайнае пачуццё закаханасці Л. Дранько-Майсюк умее ўзняць да рамантычнай легендарнасці, а яго «чароўная А.», якой прысвечаны цыкл інтымных вершаў, набывае адзнакі дантаўскай Беатрычы або пятраркаўскай Лауры: *«У Вашым голасе квітнеюць астры, / Якіх не бачыў я раней. / Мне зразумела ўсё і ўсё не ясна... / У Вашым голасе квітнеюць астры, / І кожнай кветцы Бог сказаў: квітней. / Мне зразумела ўсё і ўсё не ясна – / Ці варты музыкі такой?!»* [13, с. 30].

У паэзіі Раісы Баравіковай таксама разгортваецца матыў кахання, часта не ўзаемна-светлага, а горкага. Найбольш выразна пазіцыя паэтэсы ў гэтым пласце лірыкі выявілася ў вершы «Зорка палявая», думка якога выказана на хвалі вялікай эмацыянальнай напружанасці і шчырасці. На поўны голас, адзін за адным, раскрываюцца ў вершы – «згустку» пачуцця і роздуму, разважанні і тэзісы, што пацвярджаюць зыходны, галоўны, – лірычная гераіня гатовая ахвяраваць усім, што мае, у імя кахання – нават стаць «зоркай палявой». Вобраз лірычнай гераіні Р. Баравіковай мае выразную аўтабіяграфічную аснову, у яе жыцці спалучаюцца радасць і перажыванні трагедыі і расчаравані. Будучы жанчынай-летуценніцай, паэтка абрала асновай сваёй мастацкай творчасці адлюстраванне жывога, светлага і балючага, трапяткога пачуцця. Менавіта таму многія творы яе ўяўляюцца сапраўднай, светлай «лебядзінай песняй» рамантычнай натуры, што ідзе небяспечным шляхам, нібы па вастрыю ляза, да ўласнага шчасця, ідзе праз пакуты, перажыванні, крыўды, страты.

Сучасная паэзія ўяўляе сабой дынамічную і рухомую з’яву. У апошні час усё больш шырокую прастору ў ёй заваёўваюць монастрафічныя, нерыфмаваныя вершы. Стварэнне новых вершаваных форм набыло зараз амаль масавы характар, у выніку чаго з’явіліся іх лепшыя ўзоры, заявілі пра сябе хоку, танка, вершаказы, квантэмы, версэты, пункціры, зномы Алеся Разанава і іншых аўтараў

З імем А. Разанава звязана ўяўленне аб пошуку паэзіяй новых шляхоў, незвычайных форм, арыгінальных жанраў і стыляў. У яго асобе спалучаюцца рысы паэта-наватара, эксперыментатара, вечнага шукальніка ісціны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

моватворцы, генератара новых творчых ідэй. У кнігах А. Разанава выявілася непаўторная арыгінальнасць стылю, абумоўленая не толькі наватарствам фармальных пошукаў мастака, але зместам твораў: гістарызмам погляду на рэаліі свету, медытатыўнасцю і філасафічнасцю, асацыятыўнасцю мыслення. Пачынаючы са сваёй першай кнігі, А. Разанаў шукае і знаходзіць новыя, нетрадыцыйныя для беларускай паэзіі формы верша – пункціры, квантэмы, версэты, вершаказы, зномы.

Першымі ў творчасці Алеся Разанава з’яўляюцца пункціры – невялікія (часцей 4–6 радкоў) лірычныя мініяцюры, выкананыя па законах тонкай графікі, сфакусаваныя на перадачы адной думкі, фіксацыі аднаго пачуцця. Пункціры знешне нагадваюць хоку, але не маюць дакладных правілаў стварэння, у іх рэалізуецца глыбокі філасофскі змест, а кампазіцыя ставіцца ў прамую залежнасць ад выкарыстання дамінантнай дэталі: *«Куды? Адкуль?.. – / маўчанне... / Не дасць адказу час. / Стаю – і сам **пытанне**, іду – / і сам адказ»* [18, с. 76]. Квантэмы («квант паэтычнай энергіі» (Я. Гарадніцкі) – незавершаныя, «недасказаныя» монастрафічныя паэтычныя творы, якія складаюцца пераважна з чатырох радкоў і характарызуюцца перарывістасцю думкі, своеасаблівы імпульс да сатворчасці: *«сам-насам з незавершанасцю / што / пярэчыць перамогам / бездані ззаду»*. Звычайна падобны твор пачынаецца з малой літары і не мае знакаў прыпынку.

Версэт – адна з самых распаўсюджаных у творчасці А. Разанава вершаформ – твор прытчавага, павучальнага характару, своеасаблівы від прозапаэзіі, у якім па-філасофску глыбока, аднак лагічна ясна і завершана, пераасэнсоўваецца свет звычайных рэчаў і паняццяў: *«Я чую шмат слоў. Бачу мноства людзей. Усе яны кажуць, што трэба адрозніваць няшчырасць ад шчырасці, уяўнасць ад праўды, намер ад здзяйснення, клопат пра аднаго сябе ад клопату пра ўсіх іншых... А цяпер зіма. І словы, і людзі, і ўсё наваколле захутаны ў шэрань. І сухадрэвіны не адрозніваюцца ад дрэў»* [18, с. 276]. У працытаваным версэце «Шэрань» паэт асэнсоўвае ўяўныя і сапраўдныя каштоўнасці, якімі кіруецца чалавек ў жыцці. Апошні сінтаксічны перыяд утрымлівае важную філасофскую выснову: часам з-за шэрані правесці выразнае размежаванне паміж Дабром і Злом (пазітывам і негатывам) немагчыма.

Імкненнем наблізіць паэтычную мову да празаічнай, паглыбіць яе аналітызм, прытчавасць вызначаюцца вершаказы – творы, заснаваныя на паўторы слоў ці іх частак, а таксама на пералічэнні іншамоўных прыкладаў, якія дапамагаюць раскрыць сэнс асноўнага паняцця, вынесенага ў загаловак: *«**Грошы** шукаюць сховішчы, дзе б іх не бачылі лішнія вочы, – ці **прыгаршчы**, ці **гаршчок**, ці **гарышча**, – і аб сабе не гавораць уголас, а калі рашаюцца*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*гаварыць, то – шэпам, **шоргатам**...»* [18, с. 388], і зномы – падобныя на эссэ гнасеалагічныя адзінкі, якія выяўляюць погляд паэта на свет і быццё чалавека ў ім, на жыццё і смерць, гаротны стан мовы і бацькаўшчыны, на творчасць і мастацтва: *«Праз рознасць патэнцыялаў свядомасці звычайнай і надзвычайнай (прадбачання, інтуіцыі, натхнення) узнікае ток, што рухае думку, што жывіць творчасць»* [17, с. 244]. У працытаваных творах А. Разанава выяўляецца імкненне мастака ва ўсім дайсці да сутнасці з'яў, выявіць спецыфіку і крыніцу творчасці.

Папулярнасць у сучаснай паэзіі набывае і жанравая форма танка – монастрафічны пяцірадковы нерыфмаваны верш, у якім першы і трэці радкі маюць па пяць складоў, а астатнія – па сем. Класічная танка складаецца з 31 склада, а галоўная думка верша сканцэнтравана, як правіла, у трох першых радках. Сэнсава ўшчыльнены твор гэтай формы, які мы працытуем, пабудаваны на традыцыйным вобразным параўнанні чалавека з мятлікам, у ім сцвярджаецца тэзіс пра хуткаплыннасць жыцця чалавека: *«Пярэсты мятлік // і восенню хоча жыць – // п'е паспешліва // з хрызантэмы расінкі // марознай раніцай»* [21, с. 48].

Шырокае распаўсюджанне ў сучаснай літаратуры атрымала і жанравая форма хоку (або хайку, хай-кай) – монастрафічны трохрадковы верш, які вылучыўся з танкі і, па-сутнасці, з'яўляецца яе скарочанай формай. У хоку таксама адсутнічае рыфма, але строга захоўваецца дакладная колькасць складоў у вершарадах: у першым і трэцім – па пяць, у другім – сем. Гэта своеасаблівая цвёрдая вершаваная форма прыйшла да нас з японскай паэзіі, дзе яна актыўна ўжывалася яшчэ ў Сярэднявеччы. Максім Танк неаднаразова звяртаўся да падобнай жанравай формы (цыкл хоку са зборніка «Errata» – *«Хірасіма. На // Камені – цень чалавека. // Самога ж - няма»* [24, с. 100]).

Творчыя пошукі сучасных паэтаў абумовілі нараджэнне новых вершаваных формаў на стыку танкі і хоку – «ахвярынкі» (разважанні пра месца чалавека ў Сусвеце і Бога – *«У кожным // Адпаведна яго шчадраце // Бог расце»* [4, с. 436]) і «ясачкі» Рыгора Барадуліна. Так, напрыклад, «ясачкі» названага паэта адначасова па будове (монастрафа з трох радкоў) нагадваюць хоку (паўтанку), а па колькасці складоў – танку. Кожная з «ясачак» ўтрымлівае 31 склад, што характэрна менавіта для танкі, хоць па радках склады размеркаваны хаатычна: у адным выпадку іх – 9, 11, 11; у другім – 10, 11, 10: *«Скон – нечаканны й чаканны плён. // Чалавек – гадзіннік, які не ведае, // На колькі Усявышнім заведзены ён»* [5, с. 334].

Эдуард Акулін надаў новае дыханне газелі – віду монастрафічнага лірычнага верша, пабудаванага на 3 – 12 двухрадкоўях (бейтах) з рыфмоўкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аа, ба, ва і г.д. У апошнім бейце (макта) павінен упамінацца тахалус (імя, прозвішча ці псеўданім аўтара). Асаблівасць газелі заключаецца ў тым, што кожны бейт утрымлівае завершаную думку і мае адносна самастойнае значэнне: *«Галінка бэзу, траўнем надламаная, мая Каханая. // Ты лёсам мне, напэўна, звыш наканаваная, // мая Каханая»* [26, с. 428].

Адраджэнне адной з нетрадыцыйных для нацыянальнай паэзіі вершаваных форм – паліндрома (верша, які можа чытацца ў адваротным парадку без змен зместу), звязана з літаратурнай дзейнасцю Віктара Жыбуля, Сержа Мінскевіча, Пятра Васючэнкі і іншых аўтараў. Сучаснай паэзіі ўласцівы і такія вершаваныя формы, як лімэрык (анапеставае пяцірадкоўе), майстрам якога з'яўляецца Андрэй Хадановіч, і пагер-вершы (кароткія тэкставыя паведамленні для пэйджэраў), напісаныя Глебам Лабадзенкам.

Такім чынам, сучасная беларуская паэзія – гэта складаны мацярык, у якім суіснуе і ўзамемадзейнічае эстэтыка рэалізму і мадэрнізму, назіраецца творчае засваенне традыцый сусветнай літаратуры і пераасэнсаванне набыткаў айчыннай, у тым ліку і фальклору. Адной з галоўных прыкмет творчасці многіх сучасных паэтаў становіцца медытатыўнасць, асацыятыўнасць мыслення, роздум над заканамернасцямі чалавечага і прыроднага існавання. Сучасная літаратура характарызуецца спалучэннем рознастылёвых напрамкаў, жанрава-тэматычнай шматграннасцю, яна не толькі пазнае сучасны свет, але і прагназуе будучае, з'яўляецца дасканалай і разнастайнай у фармальных адносінах.

**Пытанні і заданні**

1. Якімі храналагічнымі рамкамі акрэсліваецца сучасны перыяд у развіцці паэзіі? Дзякуючы якім грамадска-сацыяльным падзеям яна набыла новыя якасці? Якія гэта якасці?
2. Якія стылі і напрамкі можна вылучыць у сучаснай літаратуры?
3. Ці ўласцівыя тэматычнае багацце і жанравая разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі?
4. Хто з названых намі паэтаў раней уступіў у літаратуру, хто пазней? Расстаўце ў «храналагічным парадку» прозвішчы аўтараў: Максім Танк, Янка Купала, Рыгор Барадулін, Алесь Разанаў, Генадзь Бураўкін, Яўгенія Янішчыц, Леанід Дранько-Майсюк, Янка Сіпакоў, Віктар Шніп, Рыгор Барадулін, Людміла Рублеўская.
5. Назавіце адзнакі наватарскіх пошукаў у беларускай паэзіі.
6. Што можна сказаць пра паэзію Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, Л. Рублеўскай? Якія яе тэматычныя рамкі? Які настрой яна выяўляе? Чым адрозніваецца ад паэзіі, створанай майстрамі слова старэйшых пакаленняў?
7. Падрыхтуйце вуснае паведамленне на адну з наступных тэм:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Чарнобыль у творах Міколы Мятліцкага», «Максім Танк – майстар верлібра, паэт філосаф», «Алесь Разанаў і мадэрнізм», «Гістарычная тэма ў сучаснай беларускай паэзіі».

## Літаратура


1. Арочка, М. Паэзія // М. Арочка, П. Дзюбайла, С. Лаўшук. На парозе 90-х. / М. Арочка. – Мінск, 1993.
2. Багдановіч, І. Вялікдзень: Вершы. – Менск, 1993.
3. Барадулін, Р. Быць! То Ве! / Р. Барадулін. – Мінск, 2006.
4. Барадулін, Р. Ксты / Р. Барадулін. – Мінск, 2005.
5. Барадулін, Р. Паэмы. Вершы: Збор твораў / Р. Барадулін. – Мінск, 1999. – Т. 3.
6. Башлакоў, М. Дні мае залатыя: Кніга паэзіі / М. Башлакоў. – Гомель: Сігма, 1993.
7. Бельскі, А.І. Паэзія // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя. Т. 4. Кн. 2: 1986 – 2000 / А.І. Бельскі. – Мінск, 2003. – С. 39 – 87.
8. Булыка, Г. Турмалін: Вершы / Г. Булыка. – Мінск, 1994.
9. Вярцінскі, А. Хлопчык глядзіць…: Выбр. вершы і паэмы / А. Вярцінскі. – Мінск, 1992.
10. Гарэлік, Л.М. Эстэтыка гарманічна-кантраснага адлюстравання свету ў сучаснай беларускай паэзіі / Л.М. Гарэлік // Сучасная літаратура: каардынаты ідэйна-мастацкага пошуку / С.А. Андраюк і інш.; навук рэд. В.М. Стральцовай. – Мінск, 2008. – С. 7 – 91.
11. Глобус, А. Тэксты / А. Глобус. – Мінск, 2000.
12. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці / У. Гніламёдаў. – Мінск, 2001.
13. Дранько-Майсюк, Л. Акропаль / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск, 1994.
14. Кісліцына, Г. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы / Г. Кісліцына. – Мінск, 2006.
15. Мятліцкі, М. Бабчын. Кніга Жыцця / М. Мятліцкі. – Мінск, 1996.
16. Пісьмянкоў, А. Планіда: Вершы / А. Пісьмянкоў. – Мінск, 1994.
17. Разанаў, А. Паляванне ў райскай даліне: Версэты. Паэмы. Пункціры. Вершаказы. З Велеміра Хлебнікава. Зномы / А. Разанаў. – Мінск, 1995.
18. Разанаў, А. Танец з вужакамі: Выбранае / А. Разанаў. – Мінск, 1999.
19. Рублеўская, Л. Замак месячнага сяйва: Вершы / Л. Рублеўская. – Мінск, 1992.
20. Сіпакоў, Я. Выбраныя творы ў двух тамах. Т. 2. Проза / Я. Сіпакоў. – Мінск, 1997.
21. Сіўчыкаў, У. Высакосны год / У. Сіўчыкаў. – Мінск, 2004.
22. Стральцова, В.М. Прадмова / В.М. Стральцова // Сучасная літаратура: каардынаты ідэйна-мастацкага пошуку / С.А. Андраюк і інш.; навук рэд. В.М. Стральцовай. – Мінск, 2008. – С. 3 – 6.
23. Сыс, А. Лён / А. Сыс. – Мінск, 2006.
24. Танк, М. Errata: Вершы. Пераклады / М. Танк. – Мінск, 1996.
25. Шніп, В. Балада камянёў: паэзія і проза / В. Шніп. – Мінск, 2006.
26. Яна і Я: Вершы і песні пра каханне. – Мн., 2005.
27. Янішчыц, Я. У шуме жытняга святла: Вершы, паэмы / Я. Янішчыц. – Мінск, 1988.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ